Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА імя У. І. ЛЕНІНА

№ 25 (534) Аўторак, 10 верасня 1963 г. Цана 1 кап. Год выдання XVI-ы

## ТЭЛЕГРАМА ЦАЛІННІКАЎ

**У адрас камітэта камсамола БДУ прыйшла тэлеграма ад студэнтаў універсітэта, якія працуюць зараз на будоўлях Уральскай вобласці. Вось яе тэкст:**

МІНСК БЕЛДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭТ КАМІТЭТ КАМСАМОЛА

ВІНШУЕМ ПАЧАТКАМ НАВУЧАЛЬНАГА ГОДА ЖАДАЕМ АКУРАТНА НАВЕДВАЦЬ ЛЕКЦЫІ І ВЕСЦІ КАНСПЕКТЫ ЧАКАЙЦЕ НАС ЦАЛІННІКІ.

## Група садзеяння партыйна-дзяржаўнаму кантролю прыступае да работы

У мэтах выканання дырэктывы XXII з'езда Камуністычнай партыі Савецкага Саюза лістападаўскі (1962 г.) Пленум ЦК КПСС прыняў рашэнне аб карэннай рэарганізацыі сістэмы кантролю ў краіне, паклаўшы ў яе аснову ленінскую ідэю аб спалучэнні партыйнага і дзяржаўнага кантролю, стварэнні сістэмы адзінага ўсёахопнага, пастаянна дзейнічаючага кантролю з удзелам у ім шырокіх мас камуністаў і ўсіх працоўных. **У. І. Ленін бачыў у гібкім спалучэнні савецкага з партыйным залог паспяховай работы, крыніцу надзвычайнай сілы нашай палітыкі.**

У цяперашні час створаны Камітэт партыйна-дзяржаўнага кантролю ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР, аналагічныя камітэты створаны ў саюзных, аўтаномных рэспубліках, краях, абласцях, гарадах, раёнах, пры парткомах вытворчых калгасна-саўгасных упраўленняў і прамысловых зон.

На прадпрыемствах, будоўлях, у калгасах, саўгасах, ва ўстановах, пры домакіраўніцтвах ствараюцца групы садзеяння камітэтам партыйна-дзяржаўнага кантролю з прадстаўнікоў партыйных, камсамольскіх, прафсаюзных і іншых грамадскіх арганізацый; у цэхах, аддзяленнях, на ўчастках, у брыгадах — групы або пасты садзеяння партыйна-дзяржаўнаму кантролю.

Галоўнае ў дзейнасці органаў партыйна-дзяржаўнага кантролю — аказанне дапамогі партыі і дзяржаве ў выкананні Праграмы Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, арганізацыі сістэматычнай праверкі фактычнага выканання дырэктыў партыі і ўрада, барацьбе за ўсямерны уздым сацыялістычнай эканомікі, у захаванні партыйнай і дзяржаўнай дысцыпліны і сацыялістычнай законнасці. Органы партыйна-дзяржаўнага кантролю надзелены шырокімі адміністратыўнымі правамі. Аднак яны не толькі правяраюць і караюць, але, галоўнае, папярэджваюць памылкі і магчымасць усякіх злоўжыванняў, дапамагаюць партыйным і савецкім органам выхоўваць і папярэджваць кадры ад недахопаў і промахаў у рабоце, нацэльваць іх на паспяховае рашэнне гаспадарча-палітычных задач.

З 1 верасня гэтага года пачала функцыяніраваць група садзеяння партыйна-дзяржаўнаму кантролю Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. У саставе яе 17 чалавек: А. А. Галаўко — дацэнт юрыдычнага факультэта (старшыня групы), М. А. Пауленка — кандыдат філалагічных навук (намеснік старшыні), В. І. Пракошын — аспірант, У. М. Сітнікаў — інжынер, В. І. Дубовік — ст. выкладчык, А. П. Маісееў — начальнік аховы БДУ, М. І. Юзефовіч—майстар, А. Р. Мядзведзеў — прафесар геаграфічнага факультэта, І. А. Жабчэнка — студэнт юрыдычнага факультэта, М. В. Гамеза — студэнт біялагічнага факультэта, А. В. Іпацьеў — прафесар біялагічнага факультэта, Л. І. Севасцьянава — асістэнт хімічнага факультэта, А. І. Шалудзько — ст. лабарантка хімічнага факультэта, М. М. Чапінога — загадчык кафедры матэматычнага факультэта, В. Д. Атрошчанка — студэнт гістарычнага факультэта, Я. Р. Самайловіч—студэнт геаграфічнага факультэта, Д. М. Саковіч — студэнт фізічнага факультэта.

Адбылося першае арганізацыйнае пасяджэнне групы, на якім распрацаван план яе дзейнасці, размеркаваны абавязкі паміж яе членамі. З мэтай устанаўлення шырокай сувязі з калектывам універсітэта прызнана неабходным устанавіць дзяжурства членаў групы ў памяшканні партыйнага камітэта універсітэта ў сераду з 14 да 17 гадзін дня. **У гэты час любы супрацоўнік і студэнт універсітэта можа звярнуцца да групы па пытаннях яе кампетэнцыі.** Група садзеяння партыйна - дзяржаўнаму кантролю звярнулася да калектыву універсітэта з просьбай сігналізаваць аб усіх недахопах і парушэннях, а таксама садзейнічаць групе ў іх ліквідацыі.

На пасяджэнні групы было рашана ў бліжэйшы час праверыць стан захаванасці дзяржаўнай маёмасці ў інтэрнатах універсітэта, а таксама захоўванне правіл сацыялістычнага супольнага жыцця. Будзе таксама праведзена праверка захаванасці і выкарыстання абсталявання на фізічным факультэце.

**А. А. ГАЛАЎКО,**
старшыня групы садзеяння партыйна-дзяржаўнаму кантролю.

У парткоме універсітэта

## Будаўніцтву стадыёна—скарасныя тэмпы

Для шматтысячнага калектыву студэнтаў універсітэта вельмі патрэбен свой стадыён, дзе б дзяўчаты і юнакі маглі займацца усімі відамі спорту. Рэктарат і партыйны камітэт універсітэта некалькі год назад уступілі ў хадайніцтва перад адпаведнымі органамі аб адвядзенні плошчы пад стадыён. Гарадскія арганізацыі пайшлі насустрач. Такая плошча была адведзена па вуліцы Кастрычніцкай. Там жа было распачата таксама будаўніцтва двух інтэрнатаў для студэнтаў па 400 месц кожны. Інтэрнаты пабудаваны ўжо і праз месяц прымуць у свае ўтульныя пакоі жыццёрадасных студэнтаў, а будаўніцтва стадыёна яшчэ не закончана.

З мэтаю фарсіравання тэмпаў будаўніцтва стадыёна гэтае пытанне 6 верасня было абмеркавана на пасяджэнні партыйнага камітэта універсітэта. Загадчык кафедры фізвыхавання **В. П. Шапялевіч** падрабязна далажыў членам партыйнага камітэта аб ходзе будаўніцтва. Земляныя работы на стадыёне ўжо амаль закончаны. Выкананы планіровачныя збудаванні, насыпка грунту. Нарыхтаван будаўнічы матэрыял для завяршэння дрэнажных работ. Аднак ўпераде яшчэ многа работы. Трэба закончыць узвядзенне неабходных будынкаў стадыёна, завяршыць дрэнажныя работы на баскетбольнай і валейбольнай пляцоўках, правесці водаправод і г. д.

Члены партыйнага камітэта рэктар БДУ **А. Н. Сеўчанка**, дацэнт **А. А. Галаўко**, сакратар камітэта камсамола **Г. Я. Рылюк**, прарэктар па гаспадарчай рабоце **А. В. Кірсанаў** і іншыя прынялі актыўны ўдзел у абмеркаванні надзённага пытання.

І не дзіўна, бо будаўніцтва стадыёна хвалюе ўвесь калектыў універсітэта... Стадыён будзе мець футбольнае поле з бегавой дарожкай, дзве валейбольныя і дзве баскетбольныя пляцоўкі, пляцоўку для гульні ў ручны мяч, сектар для мятанняў і прыжкоў, тэнісны корт. Якое раздолле для спартсменаў! Якія спрыяльныя ўмовы для развіцця фізкультуры і спорту ва універсітэце!

У прынятай пастанове намечаны канкрэтныя мерапрыемствы па завяршэнню будаўніцтва стадыёна. Створаны штаб па аператыўнаму кіраўніцтву будаўніцтвам стадыёна. У састаў штаба ўвайшлі **Т. Я. Дударава, А. В. Кірсанаў, В. П. Шапялевіч, Г. Я. Рылюк, І. П. Зяцькоў, П. Р. Пятровіч, В. Гапанаў.**

Для завяршэння дрэнажных работ рашана штодзённа прыцягваць да работы не менш як па 100 студэнтаў. Сакратар камітэта камсамола **Г. Я. Рылюк** заявіў на парткоме, што студэнты з ахвотай будуць працаваць над завяршэннем будаўніцтва свайго стадыёна.

Гаспадарчая частка універсітэта абавязана своечасова выдзяляць грузавы транспарт на будоўлю, а таксама забяспечваць будоўлю неабходнымі будаўнічымі матэрыяламі.

**Студэнты! Для вас будуецца выдатны стадыён. Прымем актыўны ўдзел у завяршэнні яго будаўніцтва!**

## Да ведама чытачоў

Рэдакцыя газеты «Беларускі універсітэт» запрашае прыняць удзел у яе рабоце ўсіх жадаючых праверыць свае сілы ў газетных жанрах. Проза і паэзія, малюнкі і фотаздымкі, аўтарамі якіх вы з'яўляецеся, павінны знайсці масавага чытача і гледача.

Газета «Беларускі універсітэт» мае наступныя аддзелы: партыйнага жыцця; камсамольскага і прафсаюзнага жыцця; навуковага жыцця; вучэбны; інфармацыі; аглядаў друку; культуры і быту; сатыры і гумару; літаратуры і мастацтва; фізкультуры і спорту; замежны.



Пачатак навучальнага года — адна са шматлікіх тэм перадач радыё.

**На здымку:** карэспандэнт Беларускага радыё, студэнт аддзялення журналістыкі **Аляксей Жук** гутарыць са студэнтамі першых курсаў БДУ імя У. І. Леніна.

## Універсітэт за тыдзень

* * *

*2 верасня адбыўся ўрачысты вечар, прысвечаны 18-й гадавіне Дэмакратычнай Рэспублікі В'етнам. Вечар арганізавалі в'етнамскія студэнты, што навучаюцца на 2 курсе фізічнага факультэта БДУ. З кароткім дакладам выступіў студэнт Нгуен Ван Бьюнг. Са сцэны актавай залы галоўнага корпуса в'етнамскіх студэнтаў віншавалі са святам выкладчыкі і студэнты БДУ, кубінскія студэнты, якія навучаюцца на падрыхтоўчым факультэце. Пасля ўрачыстай часткі адбыўся канцэрт мастацкай самадзейнасці, дэманстраваўся в'етнамскі кінафільм «Два салдата»*

* * *

*Наш універсітэт 4 верасня наведалі намеснік Вярхоўнага камісара па справах моладзі і спорту рэспублікі Малі, міністр Сулейман Кондэ, інспектар па справах моладзі ў Бамака Маматў Камара і інспектар па справах моладзі ў правінцыі Гао Секу Дзіакітэ. якія гасцілі ў Савецкім Саюзе па запрашэнню ЦК ВЛКСМ. Госці сустрэліся з членамі камітэта камсамола БДУ, гутарылі са студэнтамі, пабывалі ў аўдыторыях, лабараторыях, бібліятэцы, спартыўнай і актавай залах, у вылічальным цэнтры.*

* * *

*У суботу ў актавай зале галоўнага корпуса адбыўся традыцыйны вечар сустрэчы прафесарска-выкладчыцкага саставу і студэнтаў старэйшых курсаў універсітэта са студэнтамі першых курсаў.*

* * *

*На фізічным факультэце выйшаў першы ў гэтым навучальным годзе нумар насценнай газеты факультэта «За навуку»*

* * *

*На факультэтах універсітэта адбыліся арганізацыйныя сходы студэнтаў першых курсаў.*

## Цёплы прыём

**У Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію у Горках прыехала на вучобу група студэнтаў з Кубы, якая ў мінулым навучальным годзе вывучала рускую мову на падрыхтоўчым факультэце нашага універсітэта.**

**Кубінскім студэнтам быў аказаны цёплы прыём. Кветкамі і цёплай усмешкай сустрэлі іх студэнты аграфака, на якім будуць вучыцца кубінскія студэнты. Так сустракаюць толькі самых блізкіх сяброў.**

**У ленінскім пакоі інтэрната студэнты аграфака азнаёмілі кубінцаў з вучобай, жыццём і бытам студэнтаў факультэта.**

**Дэкан факультэта А. В. Каліноўскі, намеснік сакратара партбюро Г. Е. Жолнін павіншавалі кубінскіх сяброў з залічэннем іх у лік студэнтаў, пажадалі ім вялікіх творчых поспехаў.**

РЭПАРТАЖ

## Будоўлі патрабуюць

Камандзір атрада Вася Чумакоў хваляваўся: будынкі вывелі пад дах, патрэбны перакрыцці, а іх няма. Кінуўся званіць ва Уральск на завод жалезабетонных канструкцый. Незнаёмы сярдзіты голас растлумачыў: «Усе патрабуюць, усім патрэбны перакрыцці. Але што зробіш, калі Уральская вобласць — суцэльная будаўнічая пляцоўка?».

— Рук не хапае, рабочых рук, — заканчвала трубка. — Вось калі б...

Штаб атрада тэрмінова прыняў рашэнне. На другі дзень начальнік фармовачнага цэха Марыя Пятроўна Касцюк сустракала брыгаду студэнтаў з трынаццаці хлопцаў.

Скажы раней Валерыю Патапаву, Барысу Мухіну і іх сябрам, што яны будуць рабіць жалезабетонныя пліты для перакрыццяў, не паверылі б. Ды ніхто і не ўзяўся б за гэтую рызыкоўную справу. На бетоншчыка вучацца ж больш года!

...Яшчэ з аўтобуснага прыпынку чуваць, як павіскваюць лябёдкі, скрыпяць тросы кранаў.

— Дзе тут працуюць студэнты? — пытаю ў адной дзяўчыны.

— Гэта якія? Бетоншчыкі? — і яна растлумачвае, як і куды ісці. Але нават пасля яе тлумачэння цяжка адшукаць рабят сярод цэхаў, штабеляў пліт і бэляк. Прыходзіцца некалькі разоў пытаць і перапытваць.

Пяць хлопцаў рыхтуюць апалубку. Бразгаюць барты формы.

— Сяргей! — крычыць Шульгіну рабочы завода Іван Тацьянічаў. — Рыхтуй арматуру.

Рабочых завода ў гэтай змене трое: Уладзімір Бакалкін, Валянцін Шаўчэнка і Іван Тацьянічаў. Яны працуюць на бетоне не першы дзень. Я гляджу на ўпэўненыя рухі іх рук і міжволі параўноўваю заводскіх з нашымі студэнтамі. Атрымоўваецца ўражанне, што яны амаль не ўступаюць «з'еўшым вауўка» ў фармовачнай справе.

— Саша, майна! — жэстамі дапаўняе голас Сяргей Шульгін.

Вудзілішча крана вывуджвае доўгую і вузкую клетку арматуры.

— Віра! — І клетка паслухмяна кладзецца ў форму.

— Давай! — махае шаферу Валодзя Гладкі. Гудзіць матор самазвала Міхаіла Барана. Спаўзае, вывальваецца ў форму бетон. Хлопцы з рыдлёўкамі прыгаюць у кузаў, скрабуць дно. І адразу ж, бы кулямёт, трашчыць пляцовачны вібратар.

— Майна!

Страла крана апускаецца. Рабяты жалезнымі прутамі выпісваюць на пліце «БДУ», і яна, ганарыста пагойдваючыся, плыве над штабелямі бэляк і пліт у камеру. Такіх пліт ужо больш 50. Днямі 18 з іх рабяты адправілі ў Пермскі саўгас, дзе працуе іх атрад.

Майна! Віра! Трэск вібратара... І так да канца змены, пакуль не падыйдуць Валерый Патапаў, Віктар Яржэмбіцкі, Анатоль Тарнопальскі і Барыс Мухін. Яны змяняюць хлопцаў, што працавалі з раніцы.

Будоўля чакае. Будоўля просіць. Будоўля патрабуе!..

**Анатоль СЕРБАНТОВІЧ**

(З газеты **«Строительный семестр»** № 2 — органа Уральскага абкома ЛКСМ Казахстана і абласнога штаба студэнцкага будаўнічага атрада Беларусі).

## Ад Уральска да Чыліка

Каля месяца гастраліравала па калгасах і саўгасах Уральскай вобласці канцэртная брыгада мінскіх ВНУ.

У саставе брыгады— удзельнікі мастацкай самадзейнасці Беларускага дзяржаўнага універсітэта, Беларускага політэхнічнага інстытута, Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута, Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі.

Накіроўваючыся ў паездку, брыгада раздзялілася на дзве групы. Іх маршруты праходзілі па населеных пунктах, якія раскінуліся на берагах Урала, пачынаючы ад абласнога цэнтра і канчаючы гарадскім пасёлкам Чылік.

За час гастролей выканаўцы з Беларусі далі больш 60 канцэртаў. Умовы для работы канцэртных груп былі не з лёгкіх. Сцэнай для выступленняў часцей за ўсё служылі кузавы машын, пляцоўкі стадыёнаў і г. д.

Мясцовае насельніцтва вельмі цёпла сустракала выступленні самадзейных артыстаў. «Вялікае вам дзякуй, беларускія сябры», — пішуць у сваім водгуку аб канцэрце мінчан камбайнер саўгаса «Прывольны» В. Алешын і механік С. Сонцаў.

Вярнуўшыся з гастролей у г. Уральск, канцэртная брыгада дала два канцэрты ў абласным драматычным тэатры імя А. М. Астроўскага.

Уральскі абком ЛКСМ Казахстана ўзнагародзіў канцэртныя групы Ганаровымі граматамі.

**Віталій АНЦЫФЕРАЎ**

САТЫРА І ГУМАР

## У пошуках крытыкі

Гогаль не шукаў пахвалы, затое ўважліва прыслухоўваўся да ўсякіх заўваг адносна сваіх твораў, нават да заўваг яўных ганьбавальнікаў. У яго быў знаёмы саноўнік, вельмі далёкі ад літаратуры; ён паважаў Гогаля як чалавека, але не любіў яго твораў. Вось гэтаму саноўніку Гогаль прачытаў дзевяць раздзелаў другога тома «Мёртвых душ».

— Навошта вы гэта робіце? — здзіўляўся адзін з сяброў пісьменніка: — Ён нічога не разумее ў літаратуры і паэзіі!

— Што мне за карысць, — адказаў Гогаль, — чытаць тым, хто захапляецца ўсім, што я напісаў? А гэты саноўнік, слухаючы маё чытанне, адшуквае толькі слабыя месцы і крытыкуе строга і бязлітасна, а часам і вельмі разумна.

### З ЗАМЕЖНАГА ГУМАРУ

**Драма**

*У адным тэатры прадстаўленне сучаснай драмы цягнулася тры гадзіны. Ігралі да апошняга гледача.*

**На аўтакурсах**

*Курсантка ў час вучэбнай язды гаворыць інструктару:*

*— Люстэрка ў аўтамашыне дрэнна пастаўлена, нічога не відаць, акрамя аўтамабіляў, што едуць ззаду.*

## Вершы А. Сербантовіча

* * *

**Як далёка яшчэ да сталасці,**
**Як усё таямніча і нова!**
**Мне казашка адна за настаўніцу—**
**Вывучаю казахскую мову.**

**А сяброўкі жартуюць:**
**— Жэнечка,**
**І у свята ты з ім, і ў будзень,**
**На настаўніцах вучні не жэняцца,**
**І цябе твой дружок забудзе.**

**Ты у сіненькім камбінезончыку.**
**Ты іх ловіш на кожным слове.**
**Галасок твой званочкам звоніцца:**
**— Я вучу яго толькі мове...**

**І уздрыгнеш, тады калючая.**
**А чаго ты уздрыгнула — знаю.**
**Недарэмна табой я навучаны,**
**Як гучыць па-казахску «кахаю».**

**Углядаецца вечар крытыкам.**
**Тут усё таямніча і нова!**
**На каленях ляжыць нераскрытая**
**І харошая кніга «Слоўнік».**

* * *

Клуб перапоўнены, скачуць цені,
Нібы адтуль, з таямнічага свету
На саўгаснай цэнтральнай сцэне
Выступаюць факіры-студэнты.

Хлопец русы з майго пакоя —
Чуб ад сонца зрабіўся белым —
Узмахнуў над сабой рукою,
І на сцэне рака пабегла.

Бегла рэчка, наперад кацілa,
І аб бераг біліся хвалі.
А другую руку апусціў ён —
І на сцэне будынкі сталі.

Я пасля гэтых самых факіраў
Сустракаў у пустыні зноўку.
Уздымалі факіры кіркі
І капалі зямлю рыдлёўкамі.

Мітусіліся тонкія цені.
Кухня пыхкала чорным дымам.
І ў пустыні, як там, на сцэне,
Уздымаліся ў неба будынкі.

* * *

*Нібы зерневы бурт палатку*
*Вецер лашчыць, шукае шчылін.*
*Прышывае дзяўчына латкі—*
*Рамантуе маю кашулю.*

*Нітка тонкай змяёй уецца*
*І, спадаючы на калені,*
*Нібы парус кашуля б'ецца, —*
*Парус мой, парусок маленькі.*

*Шмат яму за жыццё хапіла:*
*Рваў халодны паўночны вецер,*
*Казахстанскім дажджом крапіла*
*І шматала таежнае вецце.*

*І цяпер я пад ім качую*
*Па балотах і па лясочку.*
*Асцярожна зашый яго — чуеш?*
*Ён ізноў у дарогу хоча.*

*Бачыш, сіліцца, бачыш б'ецца,*
*Рукавы ў бакі раскінуў,*
*Ён байіца: яму здаецца,*
*Што яго не вазьму я, пакіну...*

## Иван Ласков

### ШАЛАШ

Пацаны
Смастерили шалаш у забора.
Аккуратно заткнули травою
зазоры
И, внимательно выстукав
каждую пядь,
Пригласили меня ночевать,
И заснули,
Прижав угловатые плечи.
Пахло мятой и тополем...
Мне не спалось,
Словно с детством таинственным
Тихая встреча
Прочь прогнала и сон и усталость.
Темнота...
Тишина...
В переулке фонарь одинокий,
Спит на небе луна,
Разметав голубые лучи,
Слышен шорох и треск,
Слышно — песня летит издалека,
Слышно — шепчут кусты:
— Подожди... Помолчи... —
И последний огонь
на девятом погас этаже,
И лежал я, раскинув
усталые руки.
И решил:
Если будет и впредь тяжело
на душе,
Иль устану однажды
От стихов и науки,
Буду вновь ночевать
С пацанами
В таком шалаше.

# Фізкультура і спорт

## Лета за шашачнай дошкай

Успамінаючы мінулае, проста не верыш, што паяўленне першаразрадніка па шашках ва універсітэце было сенсацыяй. А гэта было не так ужо і даўно — гады тры назад. Ды і шашыстаў было мала. Усіх разраднікаў можна было пералічыць па пальцах.

За тры гады адбыліся вялікія змены: у некалькі разоў вырасла шашачная секцыя і ператварылася ў адзіны у СССР шашачны клуб пры вышэйшай навучальнай установе. Клуб аб'ядноўвае вялікую армію шашыстаў універсітэта. Ён вядзе работу па прапагандзе шашак, мае сваю насценную газету «Шашыст універсітэта», праводзіць усе універсітэцкія спаборніцтвы па шашках: класіфікацыйныя турніры ўсіх разрадаў і пачынаючых, спаборніцтвы на прыз газеты «Беларускі універсітэт». каманднае першынство універсітэта, асабістыя першынствы па рускіх і міжнародных шашках сярод мужчын, па рускіх — сярод жанчын, а з гэтага года і сярод юнакоў, курсавыя і факультэцкія турніры, арганізуе ўдзел у гарадскіх і рэспубліканскіх спаборніцтвах і г. д.

Сістэматычна, тры разы на тыдзень праводзяцца заняткі шашыстаў. Усё гэта дало магчымасць за кароткі тэрмін падрыхтаваць вялікую групу кваліфікаваных шашыстаў. Сёлета сталі кандыдатамі ў майстры матэматыкі Я. Кухарчук, Ю. Струк, А. Абрамовіч, П. Несцяровіч, фізік А. Чахаўскоі, дзесяць чалавек выканалі нарматыў першага разраду. Усяго ва універсітэце цяпер 7 кандыдатаў у майстры, 24 першаразраднікі, 70 спартсменаў 2 і 3 разрадаў.

Сёлетняе лета было багата спаборніцтвамі. Аб некаторых чытачы даведаліся ў канцы мінулага навучальнага года.

У ліпені маладзёжная зборная рэспублікі на камандным першынстве ў Чарноўцах заваявала срэбныя медалі. У саставе каманды была наша першаразрадніца А. Хапалюк.

У паўфінале першынства ЦС СДСТ «Буравеснік» па міжнародных шашках два з васьмі шашыстаў універсітэта выканалі норму кандыдата ў майстры. Гэта — П. Несцяровіч і Ю. Струк.

Кандыдаты ў майстры Я. Кухарчук, Ю. Струк, А. Абрамовіч,



**На здымку: Я. Кухарчук** (крайні злева) за разборам партыі.

Г. Драбушэвіч, першаразраднік М. Рафальскі (усе — БДУ) і майстар спорту В. Прыяткін (БПІ) абаранялі гонар Беларусі на першынстве ЦС СДСТ «Буравеснік» па рускіх шашках у Ялце. Першынства праводзілася па швейцарскай сістэме ў 10 тураў пры 30 удзельніках.

Бліскуча выступіў студэнт 4 курса матфака Я. Кухарчук. Ён набраў 6,5 ачка, раздзяліўшы 1—5 месца з майстрамі спорту Ю. Кузюковым (Горкі), А. Шагіным (Харкаў), Б. Вейцманам (Ленінград) і кандыдатам у майстры А. Очкіным (Масква). На шляху Я. Кухарчука сустрэліся 5 майстроў спорту (агульны лік з імі 2,5:2,5) і 5 кандыдатаў у майстры (лік 4:1). Гэты вынік дае права на прысваенне Кухарчуку звання майстра спорту. У канцы года ў Маскве адбудзецца матч-турнір паміж 5 пераможцамі, які выявіць чэмпіёна.

Астатнія ўдзельнікі беларускай каманды занялі такія месцы: Драбушэвіч — 8-е, Прыяткін — 12-е, Струк — 15-е, Абрамовіч — 18-е, М. Рафальскі — 22-е. Рафальскі выканаў норму для прысваення кандыдацкага бала...

Пачаўся новы навучальны год. Пачынаецца і падрыхтоўка да будучых спаборніцтваў. А будучым летам дзве універсітэцкія каманды будуць удзельнічаць у першынстве ВНУ краіны. Нашы шашысты выступяць і ў іншых спаборніцтвах: запрашаюць да сябе Кіеўскі універсітэт і Севастопальскі філіял Адэскага політэхнічнага інстытута...

Ужо аб'яўлен набор у шашачную секцыю універсітэта. Заняткі праводзяцца па панядзелках, серадах і пятніцах з 19 гадзін на кафедры фізвыхавання. Пачынаюцца класіфікацыйныя турніры. Запрашаем усіх аматараў шашак прыняць удзел у іх.

**Генадзь ДРАБУШЭВІЧ,**
кандыдат у майстры.

Рэдактар **У. КУЛАЖАНКА**

**Калектыў супрацоўнікаў юрыдычнага факультэта і аддзела праввых навук Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна выказвае глыбокае спачуванне дацэнту Меркушаву М. Н. і яго сям'і з выпадку напаткаўшага іх гора — смерці жонкі і маці Веры Антонаўны МЕРКУШАВАЙ.**

**Адрас рэдакцыі:**
Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, 212. Тэл. 2-07-19.

Друкарня Белсаўпрофа.
АТ 02512. Тыр. 2000 Зак. 3246.